2. Кунахавец-Плявака, А. І. У полі зроку журналістаў. Раённая газета ва ўмовах трансфармацыі беларускай медыяпрасторы / А. І. Кунахавец-Плявака // Беларуская думка. – 2018. – № 4. – С. 74–78.
3. Новак, А. А. Особенности формирования повести дня региональных СМИ / А. А. Новак // Вопросы теории и практики журналистики. – 2018. – № 7(1). – С. 129–144.
4. Петрушенко, А. Н. Инновационный потенциал региональных СМИ (на примере районных газет Витебской области) // Журналістыка-2016: стан, праблемы і перспектывы: матэрыялы 18-й Міжнар. навук.-практ. канф., прысвечанай 95-годдзю БДУ (10–11 лістапада 2016 г., Мінск) / БДУ, Інстытут журналістыкі; рэдкал.: С. В. Дубовік (адк. рэд.) [і інш.]. – Вып. 18. – Мінск : БДУ, 2016. – С. 90–93.
5. Самусевич, О. М. Концептуализация действительности в белорусской прессе / О. М. Самусевич // Журналистика в 2010 году: СМИ в публичной сфере. Сб. матер. Междунар. науч.-практ. конф. – М.: Факультет журналистики МГУ им. М. В. Ломоносова; Изд-во Моск. ун-та, 2011. – 560 с. – С. 177–178.
6. Самусевич, О. М. Образ автора в современном медиатексте / О. М. Самусевич // Ученые записки Таврического национального университета им. В. И. Вернадского. Серия «Филология. Социальные коммуникации». Том 22(61). – 2009 г. – С. 666–670.
7. Тертычный, А. А. Жанры периодической печати : учеб. пособие / А. А. Тертычный. – М : Аспект Пресс, 2000. – 312 с.
8. Тумилович, Н. В. Основные типологические характеристики современной региональной прессы Беларуси / Н. В. Тумилович // Веснік БДУ. Серыя 4, Філалогія. Журналістыка. Педагогіка. – Мінск: БДУ. – 2013. – №1. – С. 63–68.
9. Тумилович, Н. В. Основы творческого мастерства: учеб.-метод. комплекс / Н. В. Тумилович. – Минск: БГУ, 2014. – 152 с.



**Лілія Шасцярнёва**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (г. Мінск, Беларусь)*


## «СТО РАДКОЎ АД РЭДАКТАРА» Ў ГАЗЕЦЕ «ЛЯХАВІЦКІ ВЕСНІК»

Рэгіянальны друк Беларусі з’яўляецца адным з найбольш важных складнікаў інфармацыйнай прасторы нашай краіны. Прэстыж рэгіянальных выданняў можна патлумачыць актуальнасцю інфармацыі, магчымасцю ўзняць важныя праблемы сваёй мясцовасці і аператыўнага іх вырашэння. Разам з тым, для рэгіянальнага друку характэрныя тыя ж самыя актуальныя тэмы, што і для рэспубліканскіх выданняў.

Па дадзеных сайта www.belarus.by, на 1 сакавіка 2018 года ў Беларусі выдаваліся 751 газета і 866 часопісаў. Адзначана, што найбольш

уплывовымі ў краіне з'яўляюцца газеты «СБ. Беларусь сегодня» і «Рэспубліка». Таксама ў Беларусі папулярныя мясцовыя выпускі буйных расійскіх газет «Комсомольская правда» і «Аргументы і факты».

Сярод гэтай вялікай колькасці выданняў ёсць і раённая газета «Ляхавіцкі веснік». Першапачаткова яна выходзіла пад назвай «Савецкі патрыёт». Першы нумар з'явіўся 24 кастрычніка 1943 года. З 5 мая 1962 года раёнка выдавалася пад назвай «Будаўнік камунізму», з 1 студзеня 1991 года перайменавана ў «Ляхавіцкі веснік». Сёння газета мае тыраж амаль у 6 тысяч асобнікаў і выходзіць двойчы на тыдзень на беларускай мове.

«Ляхавіцкі веснік» – пераможца VIII (2012), лаўрэат V (2009), VI (2010), VII (2011), X (2013), XI (2014), XII (2015) Нацыянальнага конкурсу друкаваных СМІ «Залатая літара», пераможца абласнога спаборніцтва сярод рэдакцый раённых і гарадскіх газет (2013, 2008, 2007 і 2005).

З 2003 года на пасадзе галоўнага рэдактара працуе выпускніца журфака БДУ Вольга Пятроўна Барадзіна – таленавіты журналіст, лаўрэат прэміі Беларускага саюза журналістаў «Залатое пяро», заслужаны журналіст Беларускага саюза журналістаў, пераможца абласнога спаборніцтва сярод прафесійных журналістаў Брэстчыны (2009), узнагароджана знакам Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь «Выдатнік друку Беларусі». Жыхары раёна адразу палюбілі публікацыі Вольгі Пятроўны за неверагодную шчырасць, адкрытасць, актуальнасць. Спачатку доўгі час на старонках раёнкі друкаваліся «Маналогі Вольгі Барадзіной», а апошнія тры гады яна вядзе калонку «Сто радкоў ад рэдактара», дзе піша на самыя розныя тэмы. Не застаюцца па-за ўвагай рэдактара пытанні маралі, пераемнасці традыцый, культуры, філасофскія развагі. Акрамя гэтага, Вольга Пятроўна Барадзіна актыўна выступае ў друку і ў такіх рубрыках, як «Сямейны партрэт», «Аптэка для душы», «Транскрыпцыя любві» і іншых.

Калонка галоўнага рэдактара звяртае ўвагу аўдыторыі на самыя актуальныя з'явы сучаснага жыцця. Можна сказаць, што калонка «Сто радкоў ад рэдактара» – гэта сінкрэтычны жанр, бо ў ім спалучаюцца эсэ, рэцэнзіі, каментары, ёсць нават доля сатыры ад фельетона і памфлета. У калонцы выразна выяўляецца аўтарскі пачатак. Роля аўтара рэдактарскай калонкі адрозніваецца ад ролі журналіста, які часцей за ўсё прытрымліваецца нейтралітэту. Вольга Пятроўна Барадзіна дае зразумець чытачу сваю пазіцыю, выказвае сваё меркаванне, стварае атмасферу блізкіх зносін з чытачом. Калонка рэдактара адрозніваецца

асаблівай шчырасцю і арыгінальнасцю. Так, у матэрыяле «Дрэва пазнання дабра і дабраты» аўтар у своеасаблівай алегарычнай форме разважае пра тое, што неабходна захоўваць і папаўняць вечныя чалавечыя каштоўнасці – любоў, міласэрнасць, дабрыню: «*Наша ж дрэва наогул не мае ніякіх абмежаванняў, таму што сэрцы поўныя любві, відушчыя і чуйныя. Таму што не бывае чужой бяды. Таму што свет выратуе прыгажосць, а яна найперш мае душэўныя каардынаты. Таму што паняццю "дабрата" пасуе эпітэт "мудрая". ...У садзе маёй мары цягнецца да сонца наша агульнае дрэва пазнання дабра і дабраты. Вечназялёнае, круглы год у квецені і пладах, якому не генамадыфікаванасцю, а генамі чалавечнасці наканавана быць*» (Ляхавіцкі веснік. 4.01.2019). Тая ж ідэя міласэрнасці была агучана ў «Ста радках ад рэдактара» напярэдадні Новага года ў публікацыі «Цеплыня МАРОЗная»: «*Чалавек пазнае свет з першага свайго імгнення. Чалавек вучыцца дабрыні з першага свайго імгнення. Чалавек асвойвае навуку быць чалавекам з першага свайго імгнення. Няхай жа ўсе гэтыя імгненні працуюць без збояў і толькі на самае лепшае. Няхай жа не будзе плямаў на маршруце дзяцінства, які абавязаны быць светлым і прамяністым і які такім павінны зрабіцьстварыць дарослыя*» (Ляхавіцкі веснік. 30.11.2018). Сам загаловак адразу звяртае на сябе ўвагу: па-першае, ён нагадвае аксюмаран, а па-другое, у графічным выдзяленні другога слова чытаецца адразу два (МАРОЗ і марозная).

Як ужо адзначалася вышэй, жанр рэдактарскай калонкі – гэта жанр сінтэтычны, шматаспектны, які больш сканцэнтраваны на аўтарскім «я». Такая аўтарызацыя матэрыялаў патрабуе новых моўных прыёмаў у стылёвай структуры на розных узроўнях:

1) стылізацыі пад гутарку і заклік;
2) уключэнне элементаў эсэ, артыкула, каментара, пісьма, споведзі адначасова;
3) змяшчэнне элементаў эпісталярнага стылю і інш.

Выразная аўтарская пазіцыя галоўнага рэдактара прасочваецца ў матэрыяле «Мара крынічная». Вольга Пятроўна Барадзіна распавядае пра забытую людзьмі крынічку, што месціцца на беразе ракі Ведзьмы: «*А сёння ляхавіцкая крынічка сумуе: парос мохам зацвілы дэкаратыўны калодзеж, у які яна "апранута", побач усё прысыпана смеццем, зніклі дзверцы, якімі быў прыкрыты яе домік. Сумуе крынічка з-за нелюбвіраўнадушша да яе».* Выкарыстоўваючы аднародны рад дзеясловаў загаднага ладу, аўтар заклікае разам пашукаць выйсце з гэтай сітуацыі: *«А давайце падумаем разам, пафантазіруем, абмяркуем, творча*

*апрацуем разважанні на зададзеную тэму. Глядзіш – і крынічная мара спраўдзіцца. Не сама па сабе, а пры нашым хаценні, па нашым памкненні, па нашым дачыненні. «ЛВ» чакае вашых прапаноў, вашых ідэй, шаноўныя чытачы!»* (Ляхавіцкі веснік. 28.05.2018). Гэта публікацыя нагадвае праблемны артыкул. Высокая экспрэсіўнасць дасягаецца наяўнасцю рытарычных пытанняў, клічных сказаў, шматзлучнікавасцю, шматкроп'ем: *«"ЛВ"ужо звяртаўся да гэтай тэмы: чаму не зрабіць крынічнае месца адной з візітовак нашага райцэнтра? Конкурс на лепшы двор, на самы дагледжаны пад'езд, на самую арыгінальную клумбу (няхай на ёй красуюць звычайныя браткі, але ярка, шыкоўна, а не рэдкімі кусцікамі з вялікімі пралысінамі паміж імі) – хіба гэта "вышэйшая матэматыка" дызайну?! І ці не ў тэму любві тэма адказнасці за любімае?»*.

Экспрэсія – важная стылістычная катэгорыя, а спецыфіка мовы публіцыстыкі заключаецца ў вобразна-экспрэсіўных уласцівасцях. Агульнай функцыяй экспрэсіі з'яўляецца выражэнне суб'ектыўных адносін да сказанага. З боку пішучага – гэта ўзмацненне, акцэнтаванне выказвання, адступленне ад моўнага стандарту, нормы, выражэнне пачуццяў, эмоцый.

Калонка рэдактара разлічана на «суаўтарства» з чытачом, для чаго выкарыстоўваецца вялікая колькасць разнастайных спосабаў і сродкаў, накіраваных на актывізацыю мысліцельнага працэсу ў чытача, што прымушаюць яго разважаць наконт прыведзеных фактаў. Скіраванасць на актыўнае ўключэнне чытача рэалізуецца найперш у загалоўку калонкі – «лавушцы ўвагі» чытача (В. Кастамараў).

Загаловак у калонцы «Сто слоў ад рэдактара» ўяўляе цікавасць для даследавання як індывідуальны стыль аўтара. Рускі даследчык У. І Канькоў адзначае, што сукупнасць загалоўкаў прадстаўляецца самастойным маўленчым творам, аналагічным (але не ідэнтычным) разгорнутаму газетнаму тэксту [1, с. 179]. Зразумела, што асноўным элементам тэксту з'яўляецца непасрэдна сам загаловак, часта экспрэсіўны. У якасці лексічнай крыніцы экспрэсіі ў калонцы «Сто слоў ад рэдактара» шырока выкарыстоўваецца метафара, іронія, сінанімія, антанімія, аксюмарон, эпітэт, каламбур, лексічны паўтор, гульня слоў, клішаваныя фразы, прыказкі, прымаўкі, крылатыя словы і выразы, афарызмы, у тым ліку змененыя: *Хачу харчо. Не толькі і не столькі гастранамічныя прыхільнасці ўвасоблены ў загалоўку… (*Ляхавіцкі веснік. 15.06.2018); *Нелірычнае адступленне пра рэзонны рэзананс* (Ляхавіцкі веснік. 22.05.018); *Запіскі Бабы Мароза* (Ляхавіцкі веснік. 08.12.2017); *Што нялюба кнігалюбу* (Ляхавіцкі веснік.

24.11.2017); *На фоне Грушаўкі здымаецца сямейства…*(Ляхавіцкі веснік. 21.09.2018); *Жывыя і мёртвыя. Сто радкоў ад рэдактара* (Ляхавіцкі веснік. 23.05.2017); *Ёлкі-палкі* (Ляхавіцкі веснік. 20.01.2017 ); *Гусі-лебедзі* (Ляхавіцкі веснік.13.01.2017); *КультУРА і яе партытура* (Ляхавіцкі веснік.30.12.2016).

Да ліку сінтаксічных сродкаў экспрэсіі адносіцца паралелізм, анафара, эпіфара, інверсія, рытарычныя пытанні, градацыя, шматкроп'е і інш.: *«Вы не сказалі "так", мілорд. Вы не сказалі "не"…»* (Ляхавіцкі веснік. 3.10.2018); *«А шарык ляціць…»* (Ляхавіцкі веснік. 13.06.2018); *Сонца ў аконца* (Ляхавіцкі веснік. 24.03.2017).

Такім чынам, калонка «Сто радкоў ад рэдактара» Вольгі Пятроўны Барадзіной стала своеасаблівай візітоўкай раённай газеты «Ляхавіцкі веснік». Праведзены аналіз дазваляе сцвярджаць, што яе змест і лінвастылістычныя асаблівасці залежаць ад асобы аўтара, яе маўленчай крэатыўнасці, прафесійнай кампетэнтнасці і вопыту. Сваё прафесійнае крэда, прызначэнне галоўны рэдактар бачыць у наступным: *«Журналісцкае задавальненне, радасць газетчыка – калі напісаныя табою радкі пачуты, калі яны ўвасобіліся ў нейкае карыснае дзеянне, дапамогу, падтрымку, прымусілі задумацца, падштурхнулі асэнсаваць, пераасэнсаваць, зрабіць "рэвізію" ў сваёй душы...».*

*Бібліяграфічныя спасылкі*

1. Русская речь в средствах массовой информации: Речевые системы и речевые структуры / под ред. В. И. Конькова, А. Н. Потсар. – СПб.: Изд-во С.-Петерб. ун-та, 2011. – 399 с.

**Александр Шибут, Ирина Шибут**
*Белорусский государственный университет (г. Минск, Беларусь)*

# МЕДИАКОНТЕНТ В УСЛОВИЯХ ДИГИТАЛИЗАЦИИ ОБЩЕСТВА: МУЛЬТИМЕДИЙНЫЙ АСПЕКТ

За последние годы информационное пространство кардинальным образом изменилось. Ведущую роль стала играет интернет, который выступает основным каналом для получения новостей и пространством для общения. Интернет не уничтожает традиционные СМИ (телевидение, радио, прессу), но заставляет их меняться, внедрять новые форматы, технологии.

Средства массовой информации становятся мультимедийными – то есть одновременно сочетают в своих материалах текст, видео и звук.